# Слаўся, Гомельшчына, радком паэта!

*Сёлета Гомельская вобласць адзначае свой 85-гадовы юбілей. У гонар гэтай падзеі Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А. С. Пушкіна вырашыла запрасіць усіх сваіх віртуальных сяброў у літаратурнае падарожжа па краі. Гэта і паслужыла пачаткам рэалізацыі праекта «Слаўся, Гомельшчына, радком паэта!». Бо менавіта ў вершах можна коратка, але вельмі ёміста і душэўна расказаць пра сваю малую радзіму.*

Напрыканцы мінулага года мы разаслалі сваім калегам з цэнтральных бібліятэк вобласці запрашэнні прыняць удзел у мерапрыемстве і прапанавалі выбраць любы верш (на беларускай або рускай мовах) пра свой горад і прачытаць яго, зрабіўшы відэазапіс. Выканаўцам мог быць любы жадаючы. Чарговасць раёнаў мы вызначылі з дапамогай геаграфічнага становішча. І гэта не выпадкова – ідэя заключалася ў тым, каб сабраць пазл з фрагментаў-раёнаў, якія ўваходзяць у Гомельскую вобласць. А канчатковым вынікам планавалася стварэнне калекцыі відэаролікаў з вершамі пра раённыя цэнтры нашай вобласці.

Мазырская цэнтральная раённая бібліятэка імя А. С. Пушкінка дала старт эстафеце 6 студзеня, потым «эстафетная палачка» перайшла да Ельскай раённай цэнтральнай бібліятэкі... Мы размяшчалі ролікі 2 разы на тыдзень у сацыяльнай сетцы ВКонтакте з абавязковым указаннем бібліятэчных старонак. Кожны подпіс суправаджаўся цікавай інфармацыяй аб раёне, яго ўнікальнасці. Некаторыя ўдзельнікі дасылалі па 2-3 вершы.

У сакавіку праект «Слаўся, Гомельшчына, радком паэта!» завяршыўся, мы падвялі вынікі. За час літаратурнага падарожжа нам давялося пабываць у 21 раёне Гомельшчыны, пачуць 26 вершаў пра гарады вобласці, што былі прачытаны аўтарамі, чытачамі бібліятэк і бібліятэкарамі. Мы прайшлі наш юбілейны літаратурны шлях менш чым за тры месяцы, але калекцыя з відэаролікаў будзе даступная ў віртуальнай прасторы для ўсіх жадаючых.

Выкарыстанне тэхналогіі QR-кодаў дазволіла нам палегчыць пошук створаных відэаролікаў у сетцы. Фотавернісаж, прысвечаны юбілею Гомельскай вобласці, які дэманструецца ў Цэнтральнай раённай бібліятэцы імя А. С. Пушкіна, мы дапоўнілі такімі кодамі да інфармацыі аб кожным раёне. Карыстальніку бібліятэкі дастаткова навесці камеру тэлефона на код, перайсці па спасылцы і можна глядзець запіс і слухаць верш.

А ўсю калекцыю відэаролікаў можна паглядзець з дапамогай вось гэтага QR-кода.

*Аксана КУЗОЎКІНА*